# ПАМЯЦЬ

БРЭСТ

У 2 кнігах

Кніга 2-я

МІНСК
БЕЛТА
2001

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА),
Р.Р.БЫСЮК, А.П.КОНДАК, М.М.КУШ, Б.В.УЛЬЯНКА

ГАРАДСКАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

М.М.КУШ (старшыня камісіі), Р.Р.БЫСЮК (намеснік старшыні),
А.П.КОНДАК (сакратар), А.В.БАШЧУК, А.М.БЛЯХЕР, В.Р.КУШОВА, М.М.КУХТА,
З.Г.МАЛЫШАВА, У.І.НІКІЦЕНКАЎ, Т.М.НОВІКАВА, М.А.ПРАСМЫЦКІ,
В.П.РОССІХІН, С.С.САМОЙЛЕНКА, У.П.СУСЬКО, А.У.ХАРЫЧКАВА

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнік
А.П.КОНДАК

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-30-7

© БЕЛТА, 2001

## Ахова здароўя

Здароўе людзей — вялікае шчасце, бясцэннае багацце чалавека. Таму пытанне аб паляпшэнні работы медыцынскіх устаноў па ахове здароўя насельніцтва г. Брэст было актуальнае ва ўсе часы.

З 1 жніўня 1944 г. у г. Брэст быў створаны гарадскі аддзел аховы здароўя. Першым яго загадчыкам быў Г.В.Тарасаў, у лютым 1946 г. яго змяніў А.А.Балігатаў. У 1944 г. у горадзе былі адкрыты Дом дзіцяці на 60 месцаў (галоўны ўрач В.С.Касцякова), жаночая кансультацыя (загадчык Я.С.Валканыскі), дзіцячая кансультацыя і малочная кухня (загадчыца Ч.Я.Арліп



У спарткомплексе Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта

кая), гарадская бальніца (галоўны ўрач Д.А.Лазарэнкаў), цэнтральная паліклініка (загадчык Г.Л.Стрыкоўскі), вендыспансер на 40 ложкаў (галоўны ўрач Я.А.Гаўсвірт), трэцяя гарадская бальніца (галоўны ўрач С.П.Ільін), гарадская зубаўрачэбная амбулаторыя (загадчыца Н.М.Кантроўская), хуткая медыцынская дапамога (начальнік Б.С.Коган), туббальніца (галоўны ўрач В.А.Пазнееў), аблаптэкаўпраўленне (кіраўнік А.Б.Юраўскі).

У 1945 г. з'явіліся сястрынскія і фельчарскія пункты аховы здароўя, пункт пераліванпя крыві, малочна-кантрольны пункт, гарадская санітарна-эпідэміялагічная станцыя, бюро судмедэкспертызы (начальнік Д.А.Лазарэнкаў).

У 1947 г. адкрыты радзільны дом (галоўны ўрач Ф.С.Грыгор'еў), 6 пунктаў аховы здароўя, амбулаторыя на Валынцы.

За гады першай пасляваеннай пяцігодкі (1946—1950) у горадзе былі адноўлены ўсе старыя і адкрыты новыя медыцынскія ўстановы. У 1950 г. у іх працавалі 90 урачоў і 287 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу. Акрамя бальніцы на 690 ложкаў дзейнічалі 3 паліклінікі, 3 амбулаторыі, 2 дыспансеры, 5 фельчарскіх пунктаў і 5 аптэк.

У 1950 г. у горадзе быў адкрыты ўрачэбна-фізкультурны дыспансер, які меў 3 аддзяленні: лячэбнай фізкультуры і 2 урачэбнага кантролю за дарослымі спартсменамі і вучнямі дзіцячых спартыўных школ. Дыспансер забяспечваў кваліфікаваны ўрачэбны кантроль, аказваў медыцынскую дапамогу.

У 1959 г. у горадзе ўступіў у строй супрацьвалляковы дыспансер, які быў разлічаны на 25 тыс. наведванняў у год. У 1986 г. тут працавалі 4 урачы-эндакрынолагі. Дыспансер праводзіў мерапрыемствы па раннім выяўленні захворванняў залозы ўнутранай сакрэцыі, па папярэджванні і ліквідацыі эндэмічнага валляка і іншых эндакрынных захворванняў. Дыспансер з'яўляўся кансультацыйным цэнтрам вобласці па захворваннях эндакрыннай сістэмы, аказваў арганізацыйна-метадычную дапамогу лячэбным установам, выяўляў эпідэміялагічныя ачагі па валляку ў раёнах вобласці.

На працягу 1960-х гадоў у Брэсце палепшыліся ўмовы работы многіх медыцынскіх устаноў: у 1960 г. уведзена ў строй памяшканне на Граеўцы; у 1962 г. атрымаў памяшканне супрацьвалляковы дыспансер; у 1963 г. пашырана амбулаторыя Паўдпёвага гарадка, адкрыты дзённы гельмінталагічны стацыянар; у 1964 г. уведзены ў строй тыпавы будынак радзільнага дома на 180 ложкаў, палепшаны ўмовы скурнога і анкалагічнага дыспансераў, адкрыты псіханеўралагічны дыспансер, паліклініка № 2 пераехала ў новы будынак.

У 1965 г. станцыя хуткай медыцынскай дапамогі пераведзена ў капітальнае адрамантаванае памяшканне; у 1966 г. адкрыты гарадскі супрацьтуберкулёзны дыспансер, у 1967 г. — гарадскі Дом санітарнай асветы; у 1968 г. уступіла ў строй гарадская дзіцячая бальніца на 150 ложкаў з паліклінікай. Будавалася абласная бальніца з паліклінікай на 1200 наведванняў. З



Галоўны корпус Брэсцкай абласной бальніцы.

1972 г. было запраектавана будаўніцтва абласной санэпідстанцыі і медыцынскага вучылішча на 100 навучэнцаў. Брэсцкім гарвыканкомам прымаліся рашэнні аб паляпшэнні ўмоў работы Дома дзіцяці, гарадской СЭС, бюро экспертызы, Дома санітарнай асветы, эндакрыналагічнага дыспансера.

У канцы 1960-х гадоў жыхары Брэста атрымлівалі медыцынскую дапамогу ў 38 установах аховы здароўя. Для стацыянарнай дапамогі мелася 1385 ложкаў. На варце здароўя стаяла цэлая армія медыцынскіх работнікаў, сярод якіх 1454 сярэднія медыцынскія работнікі і 625 урачоў, 20 з якіх мелі высокае званне «Заслужаны ўрач БССР», 4 — вучоную ступень кандыдата медыцынскіх навук. Гэта Пётр Рамановіч Шыдлоўскі, Алена Уладзіміраўна Шыдлоўская, Васілій Рыгоравіч Пішчанка, Лізавета Аронаўна Медрын.

5 чэрвеня 1968 г. была прынята Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, а 26 чэрвеня 1968 г.  Пастанова Вярхоўнага Савета СССР, у якіх былі прадугледжаны меры па далейшым паляпшэнні аховы здароўя ў краіне. Гэтыя пастановы з'яўляліся праграмнымі дакументамі, вызначалі задачы Саветаў, органаў аховы здароўя ў справе абароны здароўя народа на многія гады.

4 кастрычніка 1968 г. выйшла Пастанова Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Савета Міністраў БССР № 311, дзе было падкрэслена, што ахова здароўя насельніцтва не толькі справа органаў аховы здароўя, але і адзін з важнейшых бакоў дзейнасці Саветаў працоўных. Менавіта з гэтых пазіцый выканком гарадскога Савета дэпутатаў працоўных вырашаў пытанні развіцця службы здароўя горада.

У пачатку 1970-х гадоў былі пабудаваны гаражы ў дзіцячай бальніцы, гарадской СЭС, прафдэзаддзяленні, паліклінікі № 2, зроблена прыбудова да будынка рэнтгенакабінета тубдыспансера.

Чыгуначнікі Брэсцкага вузла пабудавалі прафілакторый, базу адпачынку на Белым возеры, новы тыпавы будынак санэпідстанцыі. Большасць медыцынскіх устаноў была адрамантавана.

Палепшылася забеспячэнне медыцынскіх устаноў аўтатранспартам. Была ўстаноўлена прамая сувязь паміж прыёмнымі пакоямі абласной бальніцы і радзільнага дома са станцыяй хуткай дапамогі, усе машыны якой былі радыёфікаваны. Далейшае развіццё сеткі ўстаноў аховы здароўя было запланавана ажыццявіць пераважна за кошт будаўніцтва Цэнтральнай абласной бальніцы. У 1973 г. здадзена ў эксплуатацыю першая чарга абласной бальніцы, якая ўключала галоўны корпус стацыянара на 800 ложкаў, паліклініку на 1200 наведванняў, інфекцыйны корпус на 120 ложкаў, інтэрнат для ўрачоў-інтэрнаў на 215 месцаў. Другая чарга ўключала скурна-венерычны дыспансер са стацыянарам на 120 ложкаў (увод у 1979 г.), радзільны дом на 120 ложкаў (увод у 1978 г.), псіханеўралагічны дыспансер са стацыянарам на 120 ложкаў (увод у 1981 г.).

Калектывы медыцынскіх работнікаў устаноў аховы здароўя горада ў сваёй дзейнасці правялі вялікую работу па паляпшэнні медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. У 1972 г. працягвалася работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы аховы здароўя горада: была адрамантавана большасць медыцынскіх устаноў, цеплафікаваны супрацьтуберкулёзны, анкалагічны і фізкультурны дыспансеры, працягвалася будаўніцтва галоўнага корпуса абласной бальніцы, інфекцыйнага аддзялення. У стадыі заканчэння будаўніцтва знаходзіліся прыбудовы да пральні радзільнага дома і да асноўнага корпуса анкалагічнага дыспансера. У 1972 г. адкрыўся філіял дзіцячай паліклінікі ва Усходнім раёне, амбулаторыі на 40 месцаў на вул. К.Маркса, 64. У 1972 г. быў праведзены капітальны рамонт будынка радзільнага дома, уведзена ў строй гінекалагічнае аддзяленне ў чыгуначнай бальніцы. У 1973 г. радзільны дом працаваў ужо на 210 ложкаў з наступнымі аддзяленнямі: радзільнае на 130 ложкаў, паталогіі — на 40, штучнага спынення цяжарнасці — таксама на 40 ложкаў.

Брэсцкі гарвыканком стаў больш дапамагаць медыцынскім работнікам у паляпшэнні жыллёвых умоў. Калі ў 1968—1969 гг. былі палепшаны жыллёвыя ўмовы 90 медработнікам, то за 1970—1972 гг. — 246. З 1968 г. па 1973 г. у гарадскія медыцынскія ўстановы прыбылі 589 медработнікаў (129 урачоў і 360 сярэдніх медработнікаў) і выбылі 383 (75 урачоў і 30… сярэдніх медработнікаў). За 1973 г. прыбыў 21 урач і выбылі 13.

З ліку медработнікаў горада прайшлі курсы спецыялізацыі за 1968 – 1973 гг. 60 урачоў і 58 сярэдніх медработнікаў на базах інстытутаў і медвучылішчаў Мінска, Масквы, Ленінграда, Бабруйска.

Самааддана працавалі Г.Л.Лаўрыненка, галоўны ўрач радзільнага дома, заслужаны ўрач БССР, абласны хірург Ю.А.Крупень, загадчык аддзялення абласной бальніцы Я.Е.Саўчанка, а таксама медыкі Л.К.Пародзіна, В.М.Лушчык, А.Д.Пашкеева, В.С.Дарошка і інш. У кожным калектыве былі наватары, вопытныя спецыялісты, якія дасканала валодалі сучаснымі метадамі дыягностыкі і лячэння. 140 урачам і 45 сярэднім медработнікам была прысвоена вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя. Больш за 300 медработнікаў горада былі ўзнагароджаны юбілейным медалём «За доблесную працу».

У 1972 г. у дзіцячай бальніцы была арганізавана палата інтэнсіўнай тэрапіі, шырока прымянялася плазма, палепшылася забяспечанасць урачамі-педыятрамі. У інфекцыйнай бальніцы карысталіся новымі метадамі лячэння хворых з эпідэмічным гепатытам, менінгітам.

У радзільным доме пачалі аказваць спецыялізаваныя віды дапамогі цяжарным жанчынам з сардэчна-сасудзістай паталогіяй, з рэзус-несумяшчальнасцю. У жаночай кансультацыі наладжаны прыём хворых дзяўчынак дзіцячага і падлеткавага ўзросту.

У фізкабінетах добра ішло лячэнне ўльтрагукам, дыядынамічнымі токамі, баракамерай, падводным душам, аэраіанізацыяй. У 1971 г. у стацыянарах гарадскіх бальніц была аказана дапамога больш чым 23 тыс. хворых, акрамя гэтага звыш 6 тыс. хворых – у дыспансерах. За дапамогай у амбулаторыі і паліклінікі звярнуліся больш за 1,4 млн. чалавек, больш як 120 тыс. чалавек абслужаны ўрачамі дома, 52 тыс. чалавек абслужыла хуткая медыцынская дапамога. Для стацыянарнага лячэння хворых у горадзе ў 1972 г. налічвалася 1585 ложкаў.

З года ў год павялічваліся асігнаванні на патрэбы аховы здароўя. У 1970-я гады ў горадзе праводзіліся агляды-конкурсы на званне лепшага па прафесіі, у тым ліку і сярод медработнікаў. У 1978 г. лепшай па прафесіі стала медыцынская сястра дзіцячай абласной бальніцы Т.У.Ліцкевіч, выпускніца Брэсцкага медвучылішча. Ёй было прысвоена званне «Лепшая медыцынская сястра горада». Першыя месцы ў аглядах-конкурсах на званне лепшага па прафесіі займалі медыцынская сястра гарадской бальніцы В.В.Дзмітрыева, фельчар пункта аховы здароўя Г.А.Гаўрыловіч, акушэрка раддома М.М.Фрыдман, сястра-гаспадыня В.П.Венідзясюк.

У сярэдзіне 1970-х гадоў у гарадской бальніцы сфарміраваўся працаздольны калектыў. Бальніца выйшла ў лік перадавых устаноў і была ўзнагароджана Памятным знакам ГК КПБ, Ганаровым вымпелам савецкага фонду міру, граматай Міністэрства аховы здароўя БССР. У бальніцы існаваў брыгадны метад працы ўрачоў, які забяспечваў якасць і эфектыўнасць работы, а галоўнае, развіваў у калектыве дух таварыскасці, узаемадапамогі, умацоўваў працоўную дысцыпліну. Менавіта ў брыгадзе ствараліся ўмовы, пры якіх вопытныя спецыялісты былі зацікаўлены ў тым, каб моладзь павышала свой узровень. А гэта, у сваю чаргу, зніжала цякучасць кадраў, давала штуршок творчай ініцыятыве.

Важным звяном у арганізацыі медыцынскага абслугоўвання была хуткая і неадкладная медыцынская дапамога. Удасканаленне яе арганізацыі было актуальна ў сувязі з ростам сардэчна-сасудзістай паталогіі, траўматызму. Арганізацыя спецыялізаваных брыгад, забеспячэнне іх неабходнымі медыкаментамі, медыцынскім абсталяваннем дазвалялі аказваць эфектыўную медыцынскую дапамогу на дашпітальным этапе.

У 1970-я гады ў Брэсце было шмат зроблена ў медыцынскім абслугоўванні дзяцей: пашырана і ўмацавана матэрыяльная база многіх медслужбаў. У новым добраўпарадкаваным памяшканні размясціўся Дом дзіцяці, паспяхова працавалі новая дзіцячая паліклініка і бальніца. Былі палепшаны ўмовы ў будынку радзільнага дома, адкрыліся спецыялізаваныя групы ў яслях-садах па лячэнні касавокасці (яслі № 30), лагапедычныя (яслі № 29), у тыпавы будынак перавялі санаторны дзіцячы сад, рыхтаваўся да прыёму дзяцей яслі-сад для лячэння скаліёзу (№ 1), выдзелена памяшканне для малочнай кухні ва Усходнім мікрараёне.

У 1976 г. для будаўнікоў адкрыта паліклініка № 3 на 400 наведвальнікаў у дзень, паліклініка прафагляду, паліклінічнае аддзяленне на электрамеханічным заводзе, жаночая кансультацыя № 2 у Маскоўскім раёне. У 1977 г. таксама ў Маскоўскім раёне адкрыты філіял дзіцячай паліклінікі. У 1978 г. пабудаваны будынак медвучылішча, ліквідаваны дробныя амбулаторыі на Граеўцы і Валынцы. Калі ў рысы горада ўвайшлі вёскі Дуброўка, Кацін Бор, Пугачова, было арганізавана медабслугоўванне іх жыхароў, адкрыты новыя тэрапеўтычныя ўчасткі. У 1979 г. была завершана рэканструкцыя рэгістратуры ў паліклініцы № 1, у Маскоўскім раёне пачалося будаўніцтва паліклінікі для дарослых на 500 наведванняў у дзень, дзіцячай стаматалагічнай паліклінікі з уводам іх у 1980 г.

За гэты перыяд палепшана забеспячэнне лячэбных устаноў кадрамі ўрачоў і сярэдняга медперсаналу, павялічылася колькасць наведванняў да ўрачоў, палепшылася стацыянарная дапамога насельніцтву, але ўсё яшчэ востра стаяла пытанне са шпіталізацыяй, таму ўзнікла неабходнасць будаўніцтва гарадской бальніцы на 800 1000 ложкаў.

З 1975 г. па 1980 г. былі дасягнуты значныя поспехі ў рабоце хуткай дапамогі. Колькасць выязных брыгад павялічылася з 9 у 1976 г. да 17 у 1980 г. З мэтай набліжэння меддапамогі да насельніцтва і паляпшэння яе якасці ў 1981 г. у Маскоўскім раёне была адкрыта падстанцыя хуткай дапамогі.

Штогод расла колькасць акушэрскіх участкаў. Калі ў 1976 г. іх было 17, то ў 1980 г. — 20.

У мікрараёне Усход была пабудавана тыпавая дзіцячая паліклініка № 2 з басейнам на 500 наведванняў у дзень, якая стала цэнтральнай, на яе базе разгарнулі аказанне амбулаторнай спецыялізаванай дапамогі дзецям. Арганізацыя філіяла дзіцячай паліклінікі № 3 на хімзаводзе, пераразмеркаванне зон абслугоўвання тэрыторыі горада паміж трыма паліклінікамі стварылі аптымальныя ўмовы для насельніцтва горада і работы медперсаналу.

У канцы 10-й пяцігодкі (1976—1980) у горадзе дзейнічалі 54 дзіцячыя дашкольныя ўстановы, у якіх выхоўваліся 13 тыс. дзяцей (59% ад агульнай колькасці дзяцей дашкольнага ўзросту). Актуальнай заставалася праблема недахопу ўрачоўпедыятраў у школьных і дашкольных установах горада. Колькасць педыятраў усіх спецыяльнасцей за перыяд з 1975 г. па 1980 г. павялічылася з 95 да 123 па дзіцячай бальніцы, але і гэтага было недастаткова.

Была праведзена вялікая работа па павышэнні кваліфікацыі ўрачоў-педыятраў у інстытутах удасканалення ўрачоў, па мясцовых базах. Удасканаленню прафесійнага ўзроўню дзіцячых урачоў садзейнічала і атэстацыя медработнікаў. На пачатку 11-й пяцігодкі (1981—1985) прайшлі атэстацыю 20 педыятраў, з іх 7 чалавек атрымалі першую катэгорыю і 2 вышэйшую.

Вядучым звяном у дзейнасці педыятрычнай службы было абслугоўванне дзяцей у паліклініках, у якіх вялі прыём 12 спецыялістаў вузкага профілю. У горадзе была створана пастаянная сістэма нагляду за дзецьмі, ранняга выяўлення хворых і інтэнсіўнага лячэння. У выніку гэтага сярод дзяцей першага года жыцця назіраўся рост індэкса здароўя (ён павялічыўся з 15,3% да 21,6%). Знізілася дзіцячая смяротнасць: у 1975 г. яна складала 17 на 1000 народжаных дзяцей, у 1978 г. — 15 на 1000 народжаных. Вялікі ўклад у гэта ўнесла дзіцячая абласная бальніца, якой за добрую работу быў уручаны Памятны сцяг абкома КПБ, аблвыканкома, абласнога савета прафсаюзаў.

У гэтыя гады паспяхова развіваліся дзіцячая хірургія, артапедыя, уралогія, кардыялогія, эндакрыналогія. Былі створаны аддзяленні для неданошаных дзяцей. Сістэма амбулаторна-паліклінічнай дапамогі ў горадзе была на належным узроўні. Матэрыяльная база гарадской аховы здароўя за перыяд 1939—1979 гг. узрасла ў 10 разоў. За перыяд 1969—1979 гг. асігнаванні, выдзеленыя на ўтрыманне медыцынскіх устаноў, павялічыліся ў 3 разы і склалі 14% гарадскога бюджэту.

Сярод медыцынскіх работнікаў горада былі 23 заслужаныя ўрачы БССР, 6 кандыдатаў медыцынскіх навук, 19 дэпутатаў гарадскога і раённага Саветаў народных дэпутатаў, 20 закончылі клінічную ардынатуру, 60 узнагароджаны знакам «Выдатнік аховы здароўя», 125 узнагароджаны ордэ-

намі і медалямі, 240 урачоў і 62 сярэднія медыцынскія работнікі мелі кваліфікацыйныя катэгорыі, 120 штогод павышалі сваю кваліфікацыю на курсах спецыялізацыі і ўдасканалення.

З 1981 г. па 1985 г. Брэст развіваўся ў адпаведнасці з законам «Аб дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1981 — 1985 гг.», які быў зацверджаны 8-й сесіяй Брэсцкага гарадскога Савета народных дэпутатаў 17-га склікання ў 1981 г. Гэтым дакументам была вызначана галоўная задача — далейшы пад'ём матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа на аснове развіцця грамадскай вытворчасці, павышэння яе эфектыўнасці, паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу, росту прадукцыйнасці працы і паляпшэння якасці работы ва ўсіх звёнах народнай гаспадаркі.

За 11-ю пяцігодку ў будаўніцтва аб'ектаў аховы здароўя горада было ўкладзена больш за 8 млн. руб. У пачатку ўвайшлі ў строй 3 паліклінікі: дзіцячая, стаматалагічная і дарослая, адміністрацыйна-гаспадарчы корпус раддома, пачалося будаўніцтва акушэрскага корпуса на 160 ложкаў і жаночай кансультацыі № 1 з уводам яе ў строй у 1984 — 1985 гг. У 1982 г. Дом дзіцяці быў пераведзены ў г. Пінск. Укамплектаванасць урачамі і сярэднім медперсаналам склала 99%, малодшым — 78% і іншым персаналам — 67%. У горадзе працавалі каля 1 тыс. урачоў, што складала 48 урачоў на 10 тыс. чалавек насельніцтва і 2043 чалавекі сярэдняга медперсаналу, ці 100 на 10 тыс. чалавек насельніцтва. Гэтыя паказчыкі былі вышэйшыя за абласныя і рэспубліканскія. Такая колькасць медработнікаў дала магчымасць укамплектаваць кадры гарадскіх паліклінік, у якіх уводзіліся новыя метады дыягностыкі і лячэння. Толькі ў 1982 г. былі асвоены рэаграфія, механакардыяграфія, велаэргаметрыя, тамаграфія прыдаточных пазух носа, спіраграфія. У паліклініках былі адкрыты кабінеты рэфлексатэрапіі, ізатопнага абследавання, вырасла колькасць фізіяпрацэдур і ЛФК. У паліклініках у хірургаў, оталарынголагаў і акулістаў павялічылася колькасць амбулаторных аперацый.

Усё гэта садзейнічала зніжэнню захворванняў з часовай стратай працаздольнасці на ўсіх прадпрыемствах горада на 6,1 выпадка і 13,9 дня на 100 працуючых і склала ў 1982 г. 68,4 выпадка і 783,7 дня на 100 працуючых.

Сетка ўсіх медыцынскіх устаноў горада ў 1982 г. складала 2170 ложкаў, але стацыянары працавалі з перагрузкай. Для вырашэння праблемы шпіталізацыі ў гарадской бальніцы было створана спецыяльнае бюро. Былі больш жорсткія патрабаванні неабходнасці шпіталізацыі, выдзелены фіксаваныя ложкі для рабочых прамысловых прадпрыемстваў.

Бюджэтныя асігнаванні за 1982 г. установамі аховы здароўя былі асвоены на 109,7%. Гэтыя сродкі былі накіраваны на гаспадарчыя расходы, медыкаменты, харчаванне хворых, набыццё абсталявання, цвёрдага і мяккага інвентару. Асваенне асігнаванняў на капітальны рамонт склала 79%. Не быў выкананы капітальны рамонт жаночай кансультацыі № 2, радзільнага дома і аддзялення хуткай медыцынскай дапамогі гарадской бальніцы.

Для большай эфектыўнасці і даступнасці медыцынскай дапамогі быў уведзены новы рэжым работы медыцынскіх устаноў: насельніцтва, якое працуе, магло звяртацца да спецыялістаў у нерабочы час (вечарам), у выхадныя і святочныя дні. Удасканальвалася работа рэгістратуры, уводзіўся папераджальны запіс на ўсе дні тыдня, запіс да ўрача па тэлефоне.

У 1982 г. было нямала праблем у пытаннях мацярынства і дзяцінства. Заставалася яшчэ высокая смяротнасць дзяцей: у 1982 г. яна знізілася ў параўнанні з 1981 г., але была вышэйшая за абласны і рэспубліканскі паказчыкі.

Былі праблемы і ў аказанні хуткай медыцынскай дапамогі. Насельніцтва горада вырасла да 204 тыс. чалавек, а колькасць брыгад хуткай дапамогі некалькі гадоў заставалася нязменная — 16. Неабходна было адкрыць новую станцыю ў Маскоўскім раёне.

У 1983 г. асаблівае значэнне гарадская медыцына надавала пытанням прафілактыкі захворванняў. У сістэме прафілактыкі з'явіўся новы важны кампанент — штогадовая агульная дыспансерызацыя насельніцтва. Кожны трэці жыхар горада знаходзіўся пад наглядам. Перш за ўсё гэта былі дзеці і падлеткі, цяжарныя жанчыны, інва-

ліды і ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, рабочыя прадпрыемстваў, умовы працы якіх патрабавалі медыцынскага нагляду. Дыспансерны нагляд быў уведзены на прамысловых прадпрыемствах горада: фабрыцы верхняга трыкатажу, заводзе газавай апаратуры, панчошным камбінаце, швейнай фабрыцы імя Фаміна.

У пачатку 1980-х гадоў значных поспехаў дасягнуў псіханеўралагічны дыспансер. Былі раздзелены дзіцячыя і дарослыя псіхіятрычныя ўчасткі, адкрыты новыя структурныя падраздзяленні: падлеткавы кабінет (адзіны ў рэспубліцы), кабінет прафілактыкі грамадскашкодных дзеянняў і суіцыдаў, псіхагігіенічны кабінет. Палепшылася дыспансерызацыя і выяўленне псіхічна хворых, у неабходным аб'ёме ім аказвалася кваліфікаваная медыцынская дапамога. Адкрыццё падлеткавага кабінета дазволіла наладзіць цесны кантакт з інспекцыямі па справах непаўналетніх, педагагічнымі калектывамі горада. Як вынік гэтага, была магчымасць на ранніх этапах выяўляць падлеткаў з парушэннямі дысцыпліны, своечасова ажыццяўляць комплекс аздараўленчых мерапрыемстваў сярод такой катэгорыі падлеткаў.

Нягледзячы на поспехі, матэрыяльна-тэхнічная база дыспансера не дазваляла ў поўным аб'ёме ажыццяўляць аказанне спецыялізаванай псіхіятрычнай дапамогі насельніцтву, і ў сувязі з гэтым не былі прыцягнуты ў сферу матэрыяльнай вытворчасці каля тысячы псіхічна хворых. У Брэсце, адзіным з абласных цэнтраў рэспублікі, адсутнічала брыгада хуткай псіхіятрычнай дапамогі.

Свой уклад у барацьбу за здароўе гараджан уносіла Брэсцкая санітарна-эпідэміялагічная станцыя. За гады 10-й і 11-й пяцігодак былі дасягнуты значныя поспехі ў барацьбе з інфекцыйнымі захворваннямі. Дзякуючы таму, што ў горадзе была добра пастаўлена справа з прышчэпліваннем, практычна не рэгістравалася захворванне на дыфтэрыю, поліяміэліт, слупняк. Было значна зніжана захворванне на адзёр, коклюш.

Актуальнай была праблема барацьбы з вострымі кішэчнымі інфекцыямі, вірусным гепатытам. Захворванне на гэтую групу інфекцый прагрэсіравала ў дзіцячых дашкольных установах. Гэта было звязана з дастаткова высокім працэнтам нестандартнай пітной вады па бактэрыцыдных паказчыках, мноствам аварый на гарадскім водаправодзе і каналізацыі. Прычынамі высокага захворвання ў дзіцячых дашкольных установах з'яўляліся пераўкамплектаванасць (на 120 – 130%), недахоп малодшага абслуговага персаналу, недастатковая прафілактычная работа з бацькамі. Сур'ёзнай праблемай у горадзе было высокае захворванне на заразныя скурныя хваробы, асабліва на каросту і мікраспарыю. Захворванне на каросту было самым высокім сярод вучняў прафтэхвучылішчаў, тэхніку-



У дзіцячай бальніцы Брэста. Фота 1960-х гадоў

маў, студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў. Гэта было звязана з недастатковай колькасцю месцаў у інтэрнатах, нізкай санітарнай культурай.

Пачынаючы з 1970 г. у горадзе штогод рэгістраваліся выпадкі прафесійных захворванняў, вялася прафілактычная работа на пунктах аховы здароўя прамысловых прадпрыемстваў. У выніку гэтага да сярэдзіны 1980-х гадоў узровень прафзахворванняў з часовай стратай працаздольнасці пачаў зніжацца.

У 1985 г. працоўныя страты знізіліся на 18,3% у параўнанні з 1984 г. Дзякуючы зніжэнню захворванняў сярод рабочых прамысловасці было атрымана прадукцыі на суму 3 млн. 200 тыс. руб., што было роўным 1 рабочаму дню ўсіх прадпрыемстваў горада. Па даных аблсаўпрофа, агульнае захворванне працоўных горада ў 1985 г. было ніжэй за 1984 г. на 19,6% і склала 592,2 дня на 100 працуючых супраць 736,3 дня ў 1984 г.

За 11-ю пяцігодку значна палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база аховы здароўя горада. На будаўніцтва медыцынскіх устаноў было выкарыстана 9 млн. 536,2 тыс. руб., з іх 4 млн. 279,8 тыс. руб. — у 1985 г. За кошт новага будаўніцтва было ўзведзена 575 ложкаў (прырост 475 ложкаў). Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база дзіцячых лячэбна-прафілактычных устаноў: адкрыты аддзяленне неданошаных і траўміраваных дзяцей, малочная кухня, абсталявана цэнтралізаванае стэрылізацыйнае аддзяленне ў дзіцячай бальніцы.

Працягвалася будаўніцтва абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансера, жаночай кансультацыі і фізіятэрапеўтычнага корпуса ў паліклініцы № 2, станцыі пералівання крыві. Аднак план дзяржаўных капіталаўкладанняў, выдзеленых на будаўніцтва гэтых аб'ектаў, у 1985 г. не быў выкананы на 312 тыс. руб.

Калектыў стацыянара гарадской бальніцы к канцу 11-й пяцігодкі працаваў ва ўмовах перагрузкі. Патрэбы насельніцтва ў шпіталізацыі перараслі магчымасці бальніцы, значна ўскладнілі ўмовы работы персаналу і быт хворых.

У 1985 г. у горадзе нарадзіліся 5644 новых грамадзян, на 220 больш, чым у 1984 г., не было ніводнага выпадку смерці маці. Калектывы раддома і жаночых кансультацый зрабілі вельмі многа для паляпшэння работы па ўдасканальванні акушэрска-гінекалагічнай дапамогі, прафілактыкі захворвання цяжарных жанчын і нованароджаных, зніжэння дзіцячай смяротнасці. У 1985 г. дзіцячая смяротнасць была 11,8 выпадка на 1000 народжаных (самая нізкая сярод гарадоў вобласці).

У канцы 11-й пяцігодкі ў горадзе працавалі 1029 урачоў, 2380 сярэдніх медработнікаў. Сярод урачоў былі 3 кандыдаты медыцынскіх навук, 59 чалавек з вышэйшай катэгорыяй (5,5%), 167 — з першай (16,2%). Лячэбна-прафілактычныя ўстановы горада заканчвалі падрыхтоўчы этап па пераходзе да суцэльнай дыспансерызацыі.

У гады пяцігодкі ўдасканальвалася спецыялізаваная дапамога па 30 профілях. Укараняліся ў практыку новыя дасягненні медыцынскай навукі і практыкі, вопыт перадавых устаноў, асвойваліся новыя метадыкі абследавання і лячэння. Значныя поспехі былі дасягнуты ў рабоце хуткай медыцынскай дапамогі: павялічылася колькасць брыгад, былі выдзелены спецыялізаваныя брыгады. Колькасць абслугоўваемых выклікаў вырасла да 122 тыс.

У горадзе праводзілася значная работа па прапагандзе медыцынскіх і гігіенічных ведаў сярод насельніцтва, прапагандзе здаровага ладу жыцця, барацьбе са шкоднымі звычкамі. Актывізавалася антыалкагольная прапаганда: у 1985 г. было прачытана 657 лекцый, у газеце «Заря» надрукавана 5 артыкулаў, неаднаразова праходзілі тэлеперадачы і выступленні па радыё. Развіццё аховы здароўя сведчыла аб дастаткова высокім сацыяльна-эканамічным узроўні развіцця горада.

У 1986 г. у Брэсце былі 23 медыцынскія аб'яднанні і ўстановы. Сярод іх 5 бальніц, 16 паліклінік, 8 дыспансераў, 5 санітарна-эпідэміялагічных станцый, радзільны дом, Дом санітарнай асветы. На прамысловых прадпрыемствах, будоўлях, навуковых установах рабочым, служачым і студэнтам аказваў медыцынскую дапамогу 61 пункт аховы здароўя.

Усе медыцынскія ўстановы забяспечвалі насельніцтва кваліфікаванай медыцынскай дапамогай, амбулаторным і стацыянарным лячэннем хворых, ажыццяўлялі санітарную асвету і прапаганду здаровага ладу жыцця, нарыхтоўку донарскай крыві, медыцынскую экспертызу, санітарны на-

гляд за эпідэміялагічным становішчам, захоўваннем санітарных нормаў і ўмовамі працы на аб'ектах народнай гаспадаркі, кантроль за знешнім асяроддзем.

У горадзе працягвалася работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы аховы здароўя, павелічэнні магутнасці амбулаторных устаноў і паліклінік, абсталяванні ўстаноў аховы здароўя новай медыцынскай тэхнікай, лячэбна-дыягнастычнай апаратурай, мяккім і цвёрдым інвентаром.

*Было закончана будаўніцтва супрацьтуберкулёзнага дыспансера на 210 ложкаў* і станцыі пераліванія крыві. Пачалося будаўніцтва ў абласной бальніцы спецыялізаванага корпуса на 150 ложкаў і тэрапеўтычнага — на 120. Была адкрыта кансультацыя «Сям'я і шлюб». Аднак пашырэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы не вырашыла многіх праблем аховы здароўя. Гораду патрэбны былі паліклінікі і стацыянары. Для больш поўнага задавальнення насельніцтва ў медыцынскай дапамозе ў горадзе былі створаны і працавалі 3 медыцынскія каапературы, 2 з якіх стаматалагічныя і 1 па розных агульналячэбных працэдурах.

У другой палове 1980-х гадоў у структуры захворванняў на першым месцы былі прастудныя, якія складалі больш як 60% выпадкаў і 40% дзён часовай непрацаздольнасці (найбольш высокім было захворванне на грып). За 1988 г. у горадзе было выяўлена 518 анкалагічных хворых, што на 51 больш, чым у 1987 г., з іх 93 хворых 4-й клінічнай групы. Высокая анкалагічная запушчанасць сведчыла аб сур'ёзных недапрацоўках службы паліклінікі ў паўнаце і своечасовым абследаванні, асабліва пры страўнікава-кішэчных і лёгачных захворваннях, недастаткова актыўным лячэнні хворых.

У 1987 г. у горадзе было здзейснена 40 злачынстваў, звязаных з наркотыкамі. Пры гэтым на ўліку былі толькі 17 наркаманаў і 14 таксікаманаў (па вобласці). Участковымі ўрачамі горада быў выяўлены і накіраваны на лячэнне толькі адзін чалавек, які злоўжываў алкаголем.

Было нямала праблем у аказанні стаматалагічнай дапамогі, асабліва па пратэзіраванні зубоў. У пачатку 1989 г. у чарзе на пратэзіраванне зубоў знаходзіўся 16 041 чалавек. Мелі месца праблемы з якасцю пратэзіравання, а таксама скаргі па пытаннях аказання медыцынскай дапамогі ў стаматалагічных паліклініках № 1 і 2.

У канцы 1980-х — пачатку 1990-х гадоў ахова здароўя горада працягвала развіваць сваю матэрыяльна-тэхнічную базу і паспяхова вырашала пытанні, пастаўленыя ў комплекснай гарадской праграме «Здароўе».

У 1990 г. была ўведзена ў строй стаматалагічная паліклініка № 3. У 1992 г. было адкрыта зубапратэзнае аддзяленне з тэхнічнай лабараторыяй. У 1990 г. закончана будаўніцтва прыбудовы трохпавярховага *лячэбнага корпуса гарадской бальніцы і* працягвалася будаўніцтва многапрофільнай гарадской бальніцы. Былі адкрыты філіялы дзіцячай паліклінікі № 2 на вул. Луцкай і ў Паўднёвым гарадку. У медыцынскіх установах аховы здароўя працавалі 752 урачы і 1608 сярэдніх медработнікаў. Сярод іх былі 50 выдатнікаў аховы здароўя, 5 заслужаных урачоў Рэспублікі Беларусь.

У новых эканамічных умовах з 11 устаноў аховы здароўя 6 былі пераведзены на новыя ўмовы гаспадарання. Было створана 6 тэрытарыяльна-медыцынскіх аб'яднанняў. Асноўнай крыніцай фінансавання з'яўляліся сродкі бюджэту, і нязначную частку складалі даходы, якія паступалі ад платных паслуг і дагавораў з прадпрыемствамі і арганізацыямі. З мэтай атрымання дадатковых прыткоў у 1992 г. у гарадской паліклініцы № 2 быў адкрыты кабінет нетрадыцыйнага лячэння хворых.

На канец 1995 г. Брэсцкім гарвыканкомам было выдадзена 66 ліцэнзій на права займацца медыцынскай дзейнасцю малым і прыватным прадпрыемствам. У галіне стаматалогіі выдалі 15 ліцэнзій, з іх 8 суб'ектаў ажыццяўлялі гаспадарчую дзейнасць і ў сярэднім 1 суб'ект аказваў дапамогу 85 пацыентам у месяц.

У галіне афтальмалогіі працавалі 5 суб'ектаў, з іх 3 — урачы, МП «Бутэк», «Арэна-Сэрвіс». У сярэднім 1 такі суб'ект аказваў дапамогу 90 пацыентам у месяц.

Праблемамі гінекалогіі займаўся 1 суб'ект гаспадарання (у сярэднім у месяц ён аказваў дапамогу 50 пацыентам).

Псіхатэрапеўтычную дапамогу горад мог атрымаць у 6 суб'ектаў, штомесяц у сярэднім 80 пацыентам аказвалася дапамога.

Кожны месяц каля 100 грамадзян атрымлівалі лячэбны массаж у 10 суб'ектаў гаспадарання. Да гэтага можна дадаць 4

кабінеты мануальнай тэрапіі, УГД-дыягностыкі, лячэнне дзяцей з дзіцячым цэрэбральным паралічам.

Такім чынам, прыватныя ўрачы часткова знялі напружанасць у аказанні медыцынскай дапамогі, асабліва ў стаматалогіі і афтальмалогіі, хоць значнага зніжэння зваротаў па гэтых пытаннях у дзяржаўныя медыцынскія ўстановы не адбылося.

У 1995 г. у горадзе было 13 лячэбных устаноў, працавалі 3305 супрацоўнікаў: 710 урачоў, 1643 сярэдніх медработнікаў, 20 урачоў мелі вышэйшую катэгорыю, 117 — першую. У горадзе працавалі 2 стацыянарныя лячэбныя ўстановы, у тым ліку гарадская бальніца на 300 ложкаў, пабудаваная ў 1930-я гады. Было 4 дарослыя і 2 дзіцячыя паліклінікі. У горадзе пражывалі 70,5 тыс. дзяцей да 14 гадоў, з іх 340 пакутавалі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, 424 з'яўляліся інвалідамі. Быў адзначаны спад нараджальнасці: у 1995 г. за першае паўгоддзе нарадзілася на 100 дзяцей менш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Смяротнасць у горадзе склала 7,4% у 1994 г., 7,2% у 1995 г. на 1000 насельніцтва. Павялічылася колькасць няшчасных выпадкаў, якія выклікалі смерць людзей (294 выпадкаў за 1993 г. і 347 за 1994 г.) Павялічыўся паказчык дзіцячай смяротнасці і склаў за першае паўгоддзе 1994 г. 14,3%, а за гэты ж перыяд 1995 г. 17,7% на 1000 народжаных.

Нягледзячы на адсутнасць фінансавання, горад выдзяляў сродкі на паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Была ўведзена новая паліклініка для дарослых на вул. Лакцёнава на 3000 чалавек, будынак медыцынскай роты ў Паўночным гарадку перададзены станцыі хуткай медыцынскай дапамогі.

У сярэдзіне 1990-х гадоў павысіўся ўзровень захворвання на туберкулёз. Артыкулы ў прэсе пасля аварыі на ЧАЭС прывялі да страху перад рэнтгенафлюараграфічным абследаваннем, якое з'яўляецца асноўным метадам для выяўлення гэтага захворвання. У выніку гэтага пры прафілактычных аглядах у горадзе было выяўлена 28 % захварэўшых супраць 40 % па вобласці. Павялічылася інваліднасць і смяротнасць ад туберкулёзу. Сярод выяўленых хворых былі дзеці і падлеткі. З мэтай прафілактыкі і ранняга выяўлення туберкулёзу паўстала пытанне аб правядзенні рэгулярнага рэнтгенафлюараграфічнага абследавання насельніцтва горада.

На 1 студзеня 1998 г. ва ўстановах аховы здароўя горада працавалі 3463 чалавекі, з іх 801 — урачы, 1693 — сярэднія медработнікі, 617 — малодшы медперсанал і 332 — іншы персанал. Кадры аховы здароўя павялічваліся за кошт маладых спецыялістаў, але заставаліся праблемы з укамплектаваннем урачамі вузкіх спецыяльнасцей.

У горадзе працягвалася работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы аховы здароўя, ішло будаўніцтва гарадской бальніцы, праводзіўся бягучы рамонт у радзільным доме, паліклініках № 1, 2, 4, 6, праведзены рамонт філіялаў дзіцячых і стаматалагічных паліклінік. На правядзенне рамонтаў было выкарыстана 3,2 млрд. руб. (1,5%), тады калі ў 1996 г. 0,5 млрд. руб. (0,5%). Акрамя бюджэтных асігнаванняў у многіх медыцынскіх установах існавалі дадатковыя крыніцы прыбыткаў ад платных паслуг. Усяго ад платных паслуг атрымана за 1997 г. 11 млрд. руб., што больш за ўзровень 1996 г. на 1 млрд. руб., або ў 1,9 раза. Заставаліся сур'ёзныя праблемы з ма-



Спартыўнае свята ў дзіцячым садзе № 78 Брэста.

тэрыяльнай базай педыятрычнай службы горада, асабліва дзіцячай паліклінікі № 1. Гораду неабходна было пачынаць будаўніцтва новай дзіцячай паліклінікі.

Працягвалася работа па паляпшэнні водазабеспячэння, якасці пітной вады. Вялася работа па рэканструкцыі стадыёна «Дынама», добраўпарадкаванні канала, будаваўся лёгкаатлетычны манеж і іншыя аб'екты. Складаная эканамічная сітуацыя, неспрыяльны ўплыў прыроднага асяроддзя аказалі ўплыў і на здароўе гараджан. Узрасла колькасць захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, цукровага дыябету, псіхічных і анкалагічных захворванняў, захворванняў малочнай залозы, органаў дыхання, кішэчніка, прастаты, шчытападобнай залозы і інш. Як і раней, мела месца праблема з туберкулёзам, узрасла смяротнасць ад гэтага захворвання (у 1997 г. ад яго памерлі 16 чалавек). У горадзе была праведзена вялікая работа па імунапрафілактыцы супраць дыфтэрыту, што дало магчымасць скараціць колькасць захворванняў у 2,8 раза (5 выпадкаў у 1997 г. супраць 14 у 1996 г.).

Палепшылася стаматалагічная дапамога дзецям. Гэтаму садзейнічалі дадаткова адкрытыя стаматалагічныя кабінеты ў школах № 12, 14, 35, але праблемы па аказанні стаматалагічнай дапамогі даросламу насельніцтву заставаліся ранейшыя. Павялічылася колькасць інфекцыйных захворванняў: эпідэміі грыпу, эпідпаратыту, воспы, краснухі і інш. Пытанні аховы здароўя дзяцей у дашкольных установах і школах знаходзіліся пад кантролем аддзелаў аховы здароўя і адукацыі.

Нявырашаным заставалася пытанне стацыянарнай дапамогі жыхарам горада. Гарадская бальніца была па-ранейшаму перапоўнена. Для таго, каб задаволіць патрэбу насельніцтва горада хаця б у неадкладнай медыцынскай дапамозе, у ход ішлі прыстаўныя ложкі — хворыя ляжалі ў калідорах. Для зняцця гэтай праблемы неабходна было як мага хутчэй закончыць будаўніцтва шматпрофільнай бальніцы.

Вялікую дапамогу ахове здароўя аказвала санэпідслужба горада. Сваю дзейнасць яна базіравала на выкананні патрабаванняў закона Рэспублікі Беларусь «Аб санітарна-эпідэміялагічным дабрабыце насельніцтва». Пераважнымі накірункамі работы службы былі: вывучэнне становішча здароўя насельніцтва горада і асобных яго кантынгентаў, правядзенне маніторынгу за станам навакольнага асяроддзя з выяўленнем неспрыяльных фактараў і распрацоўкай мэтанакіраваных мерапрыемстваў па зніжэнні іх уплыву, працяг работы па вывучэнні пытанняў аптымізацыі харчавання насельніцтва, укараненне ў практыку мэтанакіраваных комплексных праграм і планаў па прафілактыцы інфекцыйных захворванняў, удасканаленне работы па імунапрафілактыцы.

За больш чым пяцідзесяцігадовы тэрмін развіцця гарадская ахова здароўя дасягнула многага. Значна палепшылася і ўмацавалася яе матэрыяльная база. У горадзе працуюць цудоўныя спецыялісты ў розных галінах медыцыны, дзякуючы чаму насельніцтва атрымлівае высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу ў стацыянарах і амбулаторыях.

Пра многія хваробы нашы людзі ўжо забылі, але час ставіць перад медыцынай новыя праблемы, звязаныя з катастрофай на Чарнобыльскай АЭС, СНІДам і інш. Тым не менш, як паказвае гістарычны вопыт, і гэтыя праблемы, безумоўна, будуць вырашаны, і жыхары нашага горада будуць здаровыя.

*Н.П.Галімава.*

## Бальнічка на мяжы эпох

### КАК СТРОИЛИ БОЛЬНИЦЫ ПРИ ЦАРЕ

По архивным данным, больница была построена осенью 1898 г. Уже сама предыстория ее создания содержит немало занимательного и поучительного.

В конце XIX в. Брест становится западными воротами Российской империи. Город оказывается на пересечении четырех железнодорожных линий, соединивших значимые геополитические регионы Европы. Растет число людей, занятых (как говорят старожилы до сих пор) «на колейке». Обостряется проблема их медицинского обслуживания, особенно в связи с участившимися вспышками холеры, чумы, оспы.

**Памяць:** Гіст.-дакум. хроніка Брэста. У 2 кн. Кн. 2-я. — Мн.:
П15 БЕЛТА, 2001. — 687 с.: іл.

ISBN 985-6302-30-7.

Другая кніга хронікі ахоплівае перыяд гісторыі горада ад 1941 г. да канца XX ст. У ёй расказваецца аб трагічных днях акупацыі Брэста нямецка-фашысцкімі захопнікамі і гераічнай барацьбе падпольшчыкаў, аб вызваленні горада, яго аднаўленні і пасляваенным развіцці.

Змяшчаюцца спісы загінуўшых падпольшчыкаў, партызан, мірных жыхароў горада — ахвяр фашысцкага тэрору, спісы воінаў-землякоў, што загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Прыводзяцца біяграфіі вядомых землякоў і людзей, чый лёс быў цесна звязаны з Брэстам.

Кніга будзе карыснай усім, хто цікавіцца гісторыяй Брэста.

**ББК 63.3 (4 Беи)**

## ЗМЕСТ

Да чытача ........ 17

**1941—1945**

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ ........ 19

Трагедыя вайны: фронт і палон ........ 19
Дакументы сведчаць ........ 24
Сведчаць ідавочцы ........ 25
Брэст у час нямецка-фашысцкай акупацыі ........ 31
Дакументы сведчаць ........ 38
«Новы парадак» у дзеянні ........ 42
Дакументы сведчаць ........ 46
Сведчаць ідавочцы ........ 52
Брэсцкае гета ........ 61
Дакументы сведчаць ........ 66
Ідавочцы сведчаць ........ 68
Барацьба патрыётаў Брэста супраць акупантаў ........ 73
«Заря» змагаецца ........ 91
Дакументы сведчаць ........ 93
Падпольшчыкі ўспамінаюць ........ 102
Польскае падполле ў Брэсце ........ 115
Дакументы сведчаць ........ 119
У семнаццаць хлапечых гадоў ........ 120
Партызан Мікалай Янчук ........ 121
Дзеці ў віры вайны ........ 122
Матуля ........ 127
Нельга забыць ........ 128
Вызваленне ........ 129
Пазбегнуць разгрому не ўдалося ........ 130
28-я армія ў баях за Брэст ........ 131

Загад Радзімы выкананы .......... 132
Даражыць жыццём кожнага .......... 134
Не колькасцю, а розумам .......... 135
Танкісты ў баях .......... 135
70-я армія ў баях за Брэст .......... 137
У баях 1-я стралковая дывізія .......... 137
Страчы, кулямётчык! .......... 139
Подзвіг лейтэнанта Івакіна .......... 140
«Горад был взят...» .......... 141
Пад абстрэлам кожны метр зямлі .......... 142
Паведамілі партызаны .......... 144
Дакументы сведчаць .......... 144
Званне героя за вызваленне Брэста .......... 150
Героі Савецкага Саюза, якія пахаваны ў Брэсце
ў парку імя 1 Мая .......... 154
Вайну закончыў пад Берлінам .......... 156
Раны, пакінутыя вайной .......... 157
У памяці назаўсёды .......... 159
Іх імёны ў назвах вуліц .......... 159

АХВЯРЫ ВАЙНЫ

Партызаны, падпольшчыкі, мірныя жыхары Брэста і іншых месцаў,
якія загінулі ў Брэсце ў час фашысцкай акупацыі з 22 чэрвеня 1941 г.
па 28 ліпеня 1944 г. .......... 168
Мірныя жыхары яўрэйскай нацыянальнасці, знішчаныя фашыстамі
ў Брэсцкім гета .......... 207
Воины и командиры Красной армии, погибшие, умершие от ран,
пропавшие без вести в оборонительных и освободительных боях
с фашистами в годы Великой Отечественной войны (1941 1945)
и захороненные на территории Бреста .......... 291
Умершие от ран и погибшие при исполнении служебного долга
в послевоенное время, похороненные на Гарнизонном кладбище .......... 339
Пропавшие без вести .......... 341
Воины Красной армии, участники Люблинско-Брестской операции,
погибшие в боях в конце июля 1944 г. и похороненные в Польше
на приграничной территории .......... 342
Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах
Вялікай Айчыннай вайны 1941 – 1945 гг. .......... 348
Дадатковыя звесткі да спісаў, змешчаных у 1-й кнізе
гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Брэст» .......... 373

**1945 – да нашых дзён**

У МІРНАЙ ПРАЦЫ .......... 375

Аднаўленне .......... 375
Эканоміка горада пасля вызвалення .......... 375

Народная гаспадарка ў 1944—1950-я гады ... 376
Сацыяльная сфера ў пасляваенныя гады ... 381
Сістэма аховы здароўя ў 1944—1948 гг. ... 382
Жыццё перамагае ... 383
Аднаўленне электрастанцыі ... 385
«Возрождали солдаты города и села» ... 387
І зноў пра ваду ... 388
Нямецкія ваеннапалонныя ў Брэсце ... 389
Імя і гонар вернуты ... 392
Старонкі справы № 2 ... 394
Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій ... 399
Ураджэнцы і жыхары Брэста, беспадстаўна рэпрэсіраваныя ў 1940—1950-я гады ў адміністрацыйным парадку ... 437
Добраўпарадкаванне горада ... 440
Развіццё сферы паслуг. Гандаль ... 446
Жыллёвае будаўніцтва ў горадзе ў 1950—1990-я гады ... 450
Вёскі, якія ўвайшлі ў межы Брэста ... 465
Насельніцтва Брэста ў 1945—1998 гг. ... 474
Прамысловасць Брэста ў 1950—1990-я гады ... 478
Брэсцкі электратэхнічны завод ... 483
Брэсцкі электралямпавы завод ... 484
Адкрытае акцыянернае таварыства «Брэсцкі панчошны камбінат» ... 485
Адкрытае акцыянернае таварыства «Дываны Брэста» ... 486
Адкрытае акцыянернае таварыства «Брэсцкая трыкатажная фірма «Элма» ... 487
Адкрытае акцыянернае таварыства «Брэсцкі электрамеханічны завод» ... 488
Беларуска-расійскае сумеснае ААТ «Брэстгазаапарат» ... 489
Брэсцкі лікёра-гарэлачны завод ... 492
Брэсцкі камбінат безалкагольных напіткаў ... 493
Паштовая сувязь ... 494
Тэлеграфна-тэлефонная сувязь ... 495
Чыгуначныя перавозкі ... 499
Брэсцкі аэрапорт ... 504
Рачны порт Брэст ... 508
Гісторыя Дняпроўска-Бугскага канала ... 511
Свабодная эканамічная зона «Брэст» ... 517
Брэсцкая мытня ... 519
Мытня «Заходні Буг» ... 520
З баявога летапісу Брэсцкай Чырванасцяжнай пагранічнай групы імя Ф.Э.Дзяржынскага ... 522
Міліцыя Брэста ... 525
Развіццё народнай адукацыі ... 526

Навучальна-выхаваўчая школьная і пазашкольная работа ................ 529
Настаўнік і вучні ........................................................................ 531
Ажыццяўленне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі ................................ 531
Удасканальванне выхаваўчага працэсу
ў школе ў 1970—1990-я гады ........................................................ 533
Дзіцячы дом імя Якуба Коласа ........................................................ 534
З гісторыі сярэдняй школы № 16 ...................................................... 535
Ніхто не забыты ................................................................................ 537
Байцы ўспамінаюць мінулыя дні ....................................................... 540
Брэсцкі тэхнікум чыгуначнага транспарту ........................................ 541
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт .......................................... 543
Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С.Пушкіна ............................... 545
Ахова здароўя .................................................................................. 548
Бальнічка на мяжы эпох ................................................................... 558
Брэсцкі абласны анкалагічны дыспансер .......................................... 560
Брэсцкае медвучылішча .................................................................... 562
Фізкультура і спорт .......................................................................... 564
Развіццё спорту ў 1990-я гады .......................................................... 569
Культурнае жыццё ў 1945—1990-я гады ............................................ 572
Брэсцкі абласны тэатр драмы і музыкі .............................................. 578
Брэсцкі абласны тэатр лялек ............................................................ 583
Брэсцкая дзіцячая музычная школа № 1 ............................................ 584
Брэсцкі музычны каледж імя Рыгора Шырмы .................................... 585
Брэсцкая дзіцячая харэаграфічная школа ......................................... 586
Брэсцкая дзіцячая мастацкая школа ................................................. 587
Брэсцкая дзіцячая музычная школа № 2 ............................................ 588
Брэсцкая абласная арганізацыя Беларускага саюза мастакоў ............ 588
Брэсцкае абласное музычнае таварыства .......................................... 589
Брэсцкае літаратурнае аб'яднанне .................................................... 589
Народныя самадзейныя калектывы .................................................. 590
Узорныя самадзейныя калектывы ..................................................... 592
Брэсцкая абласная бібліятэка імя М.Горкага ..................................... 593
Брэсцкая цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.С.Пушкіна ............ 595
Брэсцкая гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма ................ 596
Сродкі масавай інфармацыі Брэста .................................................. 597
Музеі Брэста ..................................................................................... 601
Музей абароны Брэсцкай крэпасці ................................................... 601
Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць – герой» ..................... 606
Брэсцкі абласны краязнаўчы музей ................................................... 611
Музей «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» ................................... 612
Могілкі Брэста .................................................................................. 614
Вызначыліся працай ......................................................................... 619
Героі Сацыялістычнай Працы ............................................................ 619
Ардэнаносцы .................................................................................... 620
Народныя артысты Беларусі ............................................................. 621

Заслужаныя работнікі Беларусі ........ 622
Лёсам звязаны з Брэстам ........ 632
Героі Савецкага Саюза, якія нарадзіліся ў Брэсце ........ 632
Героі Савецкага Саюза, жыхары Брэста ........ 633
Кавалеры трох ордэнаў Славы ........ 635
Чалавек, які аб'яднаў нацыю ........ 636
Герой Беларусі ........ 638
Ганаровыя грамадзяне ........ 639
Навукоўцы ........ 644
Доктар Громер ........ 646
Шматгранны талент ........ 647
Мастакі ........ 647
Пісьменнікі, літаратуразнаўцы ........ 650
Стваральнік «Рэспублікі Шкід» ........ 656
Нобелеўскі лаўрэат ........ 657
Першы алімпіец Брэста ........ 657
Яны кіравалі горадам ........ 658
Ваеннаслужачыя, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў ........ 658
Загінуў у Анголе ........ 669
Загінулі ў Афганістане ........ 669